© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў»

# ДРТ–2023 г.

# Тэматычнае кансультаванне па беларускай мове

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А1** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы напісаны правільна:<br>1) ***Міхасёў*** блакнот;<br>2) часопіс ***«Полымя»***;<br>3) Гомельская ***Вобласць***;<br>4) ***Налібоцкая*** пушча;<br>5) кветка ***Ландыш***.<br><br>**Адказ: 1,2,4** | 1) *Міхасёў блакнот* → прыналежны прыметнік, утвораны ад уласнага назоўніка пры дапамозе суфікса **-ёў-**, пішацца з вялікай літары;<br>2) *часопіс «Полымя»* → назоўнік, які абазначае назву часопіса, бярэцца ў двукоссе і пішацца з вялікай літары;<br>3) *Гомельская вобласць* → назоўнік, які абазначае буйную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары;<br>4) *Налібоцкая пушча* → назоўнік, які абазначае назву прыроднага геаграфічнага аб’екта (пушчы), з’яўляецца ўласным і пішацца з вялікай літары;<br>5) *кветка ландыш* → назоўнік, які абазначае назву кветкі, з’яўляецца агульным і пішацца з малой літары | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Ужыванне вялікай літары | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 24, 48.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 19, практ. 271 |
| **А2.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) страўс;<br>2) па-ударнаму;<br>3) паўкіламетра;<br>4) травка;<br>5) даўжыня.<br><br>**Адказ: 3,5** | 1) *стра́ус* → у запазычаным слове, якое заканчваецца на **-ус**, пішацца літара ***у*** (складовае);<br>2) *па-ўда́рнаму* → пасля злучка не пад націскам пішацца літара ***ў*** (нескладовае), бо прыстаўка заканчваецца на галосны;<br>3) *паўкіламе́тра* → у пачатковай частцы ***паў-*** (скарочаная частка слова ***палова***) пішацца літара ***ў*** (нескладовае);<br>4) *тра́ўка* → слова, у якім адбылося чаргаванне [**в**] з [**ў**] (*трава – траўка*), пішацца з ***ў*** (нескладовым);<br>5) *даўжыня́* → у сярэдзіне слова пасля галоснага перад зычным не пад націскам пішацца літара | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс ***у–ў*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 18.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 14 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | ***ў*** (нескладовае) | | |
| **А3.** Адзначце правільна напісаныя словы:<br>1) агенчык;<br>2) п’едэстал;<br>3) стэпь;<br>4) салаўіны;<br>5) медальён.<br><br>**Адказ: 2,4,5** | 1) *агеньчык* → перад суфіксам -***чык***-, калі слова без гэтага суфікса заканчваецца на -***нь*** (*агонь*), пішацца *мяккі знак*;<br>2) *п’едэстал* → у сярэдзіне слова пасля літары ***п*** (губны зычны гук [**п**]) перад літарай ***е***, што абазначае два гукі [**йэ**], пішацца *апостраф*;<br>3) *стэп* → пасля літары ***п*** (губны зычны гук [**п**]) літара ***ь*** не пішацца;<br>4) *салаўіны* → пасля ***ў*** (нескладовага) *апостраф* не пішацца;<br>5) *медальён* → у слове іншамоўнага паходжання пасля літары ***л*** (мяккі зычны гук [**л’**]) перад літарай ***ё***, што абазначае два гукі [**йо**], пішацца *раздзяляльны* ***ь*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс мяккага знака і апострафа | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 16.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 40.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 18 |
| **А4.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (пісьменнік) фантаст;<br>2) (дома) будаванне;<br>3) (Давыд) Гарадок;<br>4) (звыш) прыбытак;<br>5) (дзярж) праект.<br><br>**Адказ: 1,3** | 1) *пісьменнік-фантаст* → назоўнік ***пісьменнік*** з аднаслоўным прыдаткам ***фантаст*** пішацца праз злучок;<br>2) *домабудаванне* → складаны назоўнік, утвораны шляхам спалучэння дзвюх асноў ***дом***- і ***будаванн***- з дапамогай злучальнай галоснай ***а***, пішацца разам;<br>3) *Давыд-Гарадок* → складаны назоўнік, які абазначае састаўную ўласную геаграфічную назву, пішацца праз злучок;<br>4) *звышпрыбытак* → назоўнік з першай іншамоўнай часткай ***звыш***- пішацца разам;<br>5) *дзяржпраект* → складанаскарочаны назоўнік, утвораны з часткі слова ***<u>дзярж</u>***<u>*аўн*</u>-(*ы*) і поўнага слова ***праект***-□, пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 41.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А5.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:<br>1) (сонца) любівы;<br>2) (ультра) фіялетавы;<br>3) (сіне) зялёны; | 1) *сонцалюбівы* → складаны прыметнік, утвораны ад словазлучэння ***любіць сонца***, пішацца разам;<br>2) *ультрафіялетавы* → прыметнік з пачатковай | Марфалогія і арфаграфія. Утварэнне і правапіс | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 4) (дакументальна) мастацкі;<br>5) (паўночна) заходні.<br><br>**Адказ: 3,4,5** | іншамоўнай часткай ***ультра-*** пішацца разам;<br>3) *сіне-зялёны* → складаны прыметнік, які абазначае адценне колеру, пішацца праз злучок;<br>4) *дакументальна-мастацкі* → складаны прыметнік, утвораны ад двух раўнапраўных прыметнікаў, паміж якімі можна ўставіць злучнік ***і*** (***дакументальны*** і ***мастацкі***), пішацца праз злучок;<br>5) *паўночна-заходні* → складаны прыметнік, які абазначае напрамак свету, пішацца праз злучок | складаных прыметнікаў | Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 54.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А6.** Адзначце прыклады, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць разам:<br>1) стаяць (***у***) ***шчыльную***;<br>2) вучыцца ***з*** (***моладу***);<br>3) ***як*** (***след***) падрыхтавацца;<br>4) (***па***) ***летняму*** цёпла;<br>5) ***калі*** (***сьці***) наведаць.<br><br>**Адказ: 1,2,5** | 1) *стаяць ушчыльную* → пішацца разам прыслоўе, утворанае ад прыметніка з прыназоўнікам ***у***;<br>2) *вучыцца змоладу* → пішацца разам прыслоўе, утворанае ад прыметніка з прыназоўнікам ***з***;<br>3) *як след падрыхтавацца* → блізкае да прыслоўя па значэнні і функцыі спалучэнне слоў ***як след*** пішацца асобна;<br>4) *па-летняму цёпла* → прыслоўе, якое мае прыстаўку ***па-*** і заканчваецца на ***-яму***, пішацца праз злучок;<br>5) *калісьці наведаць* → прыслоўе з постфіксам ***-сьці*** пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 38–40.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |
| **А7.** Адзначце прыклады, у якіх ***не*** з выдзеленымі словамі трэба пісаць асобна:<br>1) (***не***) ***зачыняць*** дзвярэй;<br>2) (***не***) ***праглядная*** цемра;<br>3) (***не***) ***заклееныя*** канверты;<br>4) (***не***) ***спазніўшыся*** на рэпетыцыю;<br>5) (***не***) ***халодны*** вечар.<br><br>**Адказ: 1,4** | 1) *не зачыняць дзвярэй* → ***не*** з дзеясловам пішацца асобна;<br>2) *непраглядная цемра* → ***не-*** – прыстаўка, без якой слова ***непраглядная*** не ўжываецца;<br>3) *незаклееныя канверты* → ***не*** з поўным дзеепрыметнікам, пры якім няма залежнага слова, пішацца разам;<br>4) *не спазніўшыся на рэпетыцыю* → ***не*** з дзееприслоўем пішацца асобна;<br>5) *нехалодны вечар* → ***не*** з прыметнікам, які можна замяніць сінонімам без ***не*** (***цёплы***), пішацца разам | Марфалогія і арфаграфія. Правапіс часціцы ***не*** з рознымі часцінамі мовы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 55.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 8, 27, 29, 52.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 4 |
| **А8.** Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:<br>1) выбачаць суседа;<br>2) разважаць пра шчасце;<br>3) чатыры студэнта;<br>4) пайсці за грыбамі;<br>5) бачыць на свае вочы.<br><br>**Адказ: 2,5** | 1) *выбачаць суседу* → пры дзеяслове са значэннем ветлівасці ***выбачаць*** назоўнік ужываецца ў форме давальнага склону;<br>2) *разважаць пра шчасце* → пры дзеяслове са значэннем думкі ***разважаць*** назоўнік ужываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***пра***;<br>3) *чатыры студэнты* → пры лічэбніку ***чытыры*** назоўнік ужываецца ў форме назоўнага склону множнага ліку;<br>4) *пайсці ў грыбы* → пры дзеяслове са значэннем руху ***пайсці*** назоўнік ***грыбы*** ўжываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам ***у***;<br>5) *бачыць на свае вочы* → характэрная для беларускай літаратурнай мовы сінтаксічная канструкцыя | Сінтаксіс і пунктуацыя. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай) | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 59.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – С. 55, 56.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : з электронным дадаткам для павыш. узроўню / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 33.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 3 |
| **А9.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Дарога хоць бокам каціся.<br>2) Людзі ў нас – працавітыя.<br>3) Валошкі – аздоба жыта.<br>4) Касіць – няпростая справа.<br>5) Журавель, бясспрэчна, – гаспадар балот.<br><br>**Адказ: 3,4** | 1) *Дарога* **–** *хоць бокам каціся.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным фразеалагізмам, ставіцца працяжнік;<br>2) *Людзі ў нас працавітыя.* → паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным прыметнікам, працяжнік не ставіцца;<br>3) *Валошкі – аздоба жыта.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, ставіцца працяжнік;<br>4) *Касіць – няпростая справа.* → паміж | Сінтаксіс і пунктуацыя. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 20.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | дзейнікам, выражаным інфінітывам, і выказнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, ставіцца працяжнік;<br>5) *Журавель, бясспрэчна, гаспадар балот.* → паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону, стаіць пабочнае слова ***бясспрэчна***, таму працяжнік не ставіцца | | |
| **А10.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:<br>1) У назвы найпрыгажэйшых__ беларускіх мясцовасцей Добруш, Дабрасельцава ўвайшло слова «дабро».<br>2) Тураўскае Евангелле яскрава__ дакладна пацвярджае існаванне ў старажытным Тураве кнігапісання.<br>3) На бярозкі__ і на дубы, і на ялінкі апускаюцца бліскучыя сняжынкі.<br>4) Аблавуха, брыль, каптур__ усё гэта назвы галаўных убораў беларусаў.<br>5) Калядны снег не ідзе__ а вальсуе.<br><br>**Адказ: 2,3,5** | 1) *У назвы найпрыгажэйшых беларускіх мясцовасцей Добруш, Дабрасельцава ўвайшло слова «дабро».* → паміж неаднароднымі азначэннямі, выражанымі якасным прыметнікам ***найпрыгажэйшых*** і адносным прыметнікам ***беларускіх***, коска не ставіцца;<br>2) *Тураўскае Евангелле яскрава**,** дакладна пацвярджае існаванне ў старажытным Тураве кнігапісання.* → паміж аднароднымі акалічнасцямі, звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, ставіцца коска;<br>3) *На бярозкі**,** і на дубы, і на ялінкі апускаюцца бліскучыя сняжынкі.* → коскамі раздзяляюцца ўсе аднародныя акалічнасці, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам ***і***;<br>4) *Аблавуха, брыль, каптур* **–** *усё гэта назвы галаўных убораў беларусаў.* → ***усё гэта*** – спалучэнне, якое выконвае функцыю абагульняльнага слова; пасля аднародных членаў сказа (дзейнікаў) перад абагульняльным словам ставіцца працяжнік;<br>5) *Калядны снег не ідзе**,** а вальсуе.* → паміж аднароднымі выказнікамі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка ***а***, ставіцца коска | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх) | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 26, 27.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31–35.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – практ. 41.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 5 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А11.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) Празрыстыя, нібы крышталь, нашы азёры.<br>2) Песня жаваранка, нібыта гушкалася на аблачынцы.<br>3) Электронныя кнігі, быццам штучныя кветкі.<br>4) Радашковічы нам вядомы як край самабытных ганчароў.<br>5) Мяце густы, што рысавая каша, снег.<br><br>**Адказ: 1,4,5** | 1) *Празрыстыя, нібы крышталь, нашы азёры.* → параўнальны зварот выдзяляецца коскамі;<br>2) *Песня жаваранка нібыта гушкалася на аблачынцы.* → паміж дзейнікам і выказнікам коска не ставіцца;<br>3) *Электронныя кнігі быццам штучныя кветкі.* → паміж дзейнікам і выказнікам коска не ставіцца;<br>4) *Радашковічы нам вядомы як край самабытных ганчароў.* → не аддзяляецца коскай зварот, які мае значэнне '*ў якасці*' (*Радашковічы* і ёсць *край самабытных ганчароў*);<br>5) *Мяце густы, што рысавая каша, снег.* → параўнальны зварот выдзяляецца коскамі | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 45, 46.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 10 |
| **А12.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць знак прыпынку:<br>1) Пасоленыя ў дубовых бочках__ грузды з'яўляліся некалі абавязковай стравай на сялянскім стале.<br>2) Першыя кнігі былі вельмі дарагія: кожную з іх перапісвалі на працягу некалькіх гадоў__ аздабляючы вокладку каштоўнымі камянямі і золатам.<br>3) Акрамя баскетбола__ я з задавальненнем займаюся тэнісам.<br>4) Люблю па лясных сцяжынках гуляць__ не спяшаючыся.<br>5) Здаўшы экзамен на выдатна, бегла дадому Васілінка__ ног пад сабой не чуючы.<br><br>**Адказ: 2,3** | 1) *Пасоленыя ў дубовых бочках грузды з'яўляліся некалі абавязковай стравай на сялянскім стале.* → дапасаванае азначэнне, якое выражана дзеепрыметнікавым зваротам, стаіць перад паяснёным назоўнікам ***грузды*** і не мае дадатковага акалічнаснага значэння прычыны ці ўступкі, не аддзяляецца коскай;<br>2) *Першыя кнігі былі вельмі дарагія: кожную з іх перапісвалі на працягу некалькіх гадоў**,** аздабляючы вокладку каштоўнымі камянямі і золатам.* → акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным зваротам, аддзяляецца коскай;<br>3) *Акрамя баскетбола**,** я з задавальненнем займаюся тэнісам.* → дапаўненне, выражанае назоўнікам у родным склоне з прыназоўнікам ***акрамя***, аддзяляецца коскай;<br>4) *Люблю па лясных сцяжынках гуляць не спяшаючыся.* → не аддзяляецца коскай выражаная адзіночным дзеепрыслоўем акалічнасць ***не спяшаючыся***, якая стаіць пасля дзеяслова-выказніка і сваім значэннем набліжаецца да прыслоўя спосабу дзеяння | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 22, 30.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 39, 40, 42, 43.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 7 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | (адказвае на пытанне *як?*);<br>5) *Здаўшы экзамен на выдатна, бегла дадому Васілінка ног пад сабой не чуючы.* → не аддзяляецца коскай акалічнасць ***ног пад сабой не чуючы***, якая з'яўляецца фразеалагізмам | | |
| **А13.** Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коскі:<br>1) Сабе самому__ кажуць__ дапаможаш, калі будзеш імкнуцца дапамагчы іншым.<br>2) Барадатая кугакаўка__ ці чулі?__ атрымала такую назву дзякуючы цёмнай пляме пад дзюбай, якая нагадвае бараду.<br>3) Снегіры, сініцы, галкі-забіякі на снезе зіхоткім__ зірніце__ пакідаюць сляды-знакі.<br>4) На сваім падворку і певень__ бывае__ смелым.<br>5) Шчасця__ на маю думку__ не купіш і за вялікія грошы.<br><br>**Адказ: 1,3,5** | 1) *Сабе самому**,** кажуць**,** дапаможаш, калі будзеш імкнуцца дапамагчы іншым.* → слова ***кажуць***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не з'яўляецца членам сказа, а ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным і выдзяляецца коскамі;<br>2) *Барадатая кугакаўка **(**ці чулі?**)** атрымала такую назву дзякуючы цёмнай пляме пад дзюбай, якая нагадвае бараду.* → пытальны сказ ***ці чулі?***, які па сэнсе і граматычна не звязаны з асноўным зместам сказа, а падаецца як дадатковая заўвага, з'яўляецца ўстаўным; устаўны сказ выдзяляецца дужкамі або працяжнікамі;<br>3) *Снегіры, сініцы, галкі-забіякі на снезе зіхоткім**,** зірніце**,** пакідаюць сляды-знакі.* → слова ***зірніце***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не член сказа, а выражае імкненне наладзіць кантакт з суразмоўцам, з'яўляецца пабочным і выдзяляецца коскамі;<br>4) *На сваім падворку і певень бывае смелым.* → слова ***бывае*** ўваходзіць у састаўны іменны выказнік ***бывае смелым*** і коскамі не выдзяляецца;<br>5) *Шчасця**,** на маю думку**,** не купіш і за вялікія грошы.* → словазлучэнне ***на маю думку***, якое граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе, не член сказа, а ўказвае на крыніцу паведамлення, з'яўляецца пабочным і выдзяляецца коскамі | Сінтаксіс і пунктуацыя. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 18, 38.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 9 |
| **А14.** Адзначце складаназлучаныя сказы, паміж часткамі якіх трэба паставіць знак прыпынку: | 1) *Слава аднаго толькі злёгку пагушкае**,** а другога яна аж да зор падкінуць можа.* → | Сінтаксіс і пунктуацыя. | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| 1) Слава аднаго толькі злёгку пагушкае а другога яна аж да зор падкінуць можа.<br>2) То адзін чалавек прыдумае нешта новае то другі раптам здолее апярэдзіць свой час.<br>3) Сонца спаць пайшло за горку і адразу зазіхацелі ў небе першыя зоркі.<br>4) Васільковае неба і рамонкавы луг.<br>5) Пра адвагу нашых продкаў гамоняць Полацка вежы і распавядаюць берагі Дзвіны.<br><br>**Адказ: 1,2,3** | паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць супастаўляльныя сэнсавыя адносіны і звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ***а***, ставіцца коска;<br>2) *То адзін чалавек прыдумае нешта новае**,** то другі раптам здолее апярэдзіць свой час.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць размеркавальныя сэнсавыя адносіны і звязаны пры дапамозе паўторнага размеркавальнага злучніка ***то*** – ***то***, ставіцца коска;<br>3) *Сонца спаць пайшло за горку* ***–*** *і адразу зазіхацелі ў небе першыя зоркі.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія паказваюць на хуткую змену падзей і звязаны спалучальным злучнікам ***і***, ставіцца працяжнік;<br>4) *Васільковае неба і рамонкавы луг.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія з'яўляюцца назыўнымі сказамі, перад адзіночным спалучальным злучнікам ***і*** знак прыпынку не ставіцца;<br>5) *Пра адвагу нашых продкаў гамоняць Полацка вежы і распавядаюць берагі Дзвіны.* → паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць спалучальныя сэнсавыя адносіны і звязаны пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***і***, не ставіцца знак прыпынку, бо ў першай ёсць агульныя для абедзвюх частак даданыя члены сказа ***Пра адвагу нашых продкаў*** | Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 10–14.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 11 |
| **А15.** Адзначце сказы, у якіх няма парушэння пунктуацыйных нормаў:<br>1) У 2023 годзе птушкай года ў Беларусі названа звычайная туркаўка, якая мае вельмі прыгожую афарбоўку і дзіўны голас.<br>2) Плывуць аблокі і не кажуць, куды.<br>3) Падарунак прыроды, які не мае цаны і без якога чалавеку не выжыць, называецца вадой.<br>4) Гавораць, што, калі пакласці ў кішэню | 1) *У 2023 годзе птушкай года ў Беларусі названа звычайная туркаўка, якая мае вельмі прыгожую афарбоўку і дзіўны голас.* → складаназалежны сказ, у якім аддзяляецца коскай даданая частка, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова ***якая***;<br>2) *Плывуць аблокі і не кажуць куды.* → складаназалежны сказ, у якім даданую частку, | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 15–24.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| восеньскія каштаны, настрой заўсёды будзе добры.<br>5) Вакол Свіцязі расце шмат рэдкіх парод раслін і дрэў многія з каторых занесены ў Чырвоную кнігу.<br><br>**Адказ: 1,3,4** | што стаіць пасля галоўнай і выражана адным словам ***куды***, не трэба аддзяляць знакам прыпынку;<br>3) *Падарунак прыроды, які не мае цаны і без якога чалавеку не выжыць, называецца вадой.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, якія стаяць у сярэдзіне галоўнай, паясняюць у ёй словазлучэнне ***падарунак прыроды***, адказваюць на адно і тое ж пытанне *які?*, з’яўляюцца аднароднымі і з двух бакоў выдзяляюцца коскамі; паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам ***і***, знак прыпынку не ставіцца;<br>4) *Гавораць, што, калі пакласці ў кішэню восеньскія каштаны, настрой заўсёды будзе добры.* → складаназалежны сказ з дзвюма даданымі часткамі, дзе паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач, ставіцца коска, бо няма другой часткі ***то*** (***дык***) парнага злучніка ***калі*** – ***то*** (***калі*** – ***дык***);<br>5) *Вакол Свіцязі расце шмат рэдкіх парод раслін і дрэў**,** многія з каторых занесены ў Чырвоную кнігу.* → складаназалежны сказ, у якім аддзяляецца коскай даданая частка, што стаіць пасля галоўнай і звязана з ёй пры дапамозе злучальнага слова (*многія з* ***каторых*** |  | навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 12 |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А16.** Адзначце сказы, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку паміж часткамі сказаў не пастаўлены): **[ ]: [ ].**<br>1) Хутка зноў у высокім небе званочкам жаваранак зазвініць хутка зноў сваё вітанне нам з паднябесся кінуць жураўлі.<br>2) У полі жыта даспявала навокал ліпы хораша цвілі.<br>3) На дзень раней пасееш тыднем раней можна будзе ўраджай сабраць.<br>4) Правіла гэта ўсім вядомае сябруе з галоснымі «ў».<br>5) У бабулінай хаце для мяне найлепшы ранак блінцы са свежай смятанкай заўсёды падаюцца на сняданак.<br><br>**Адказ: 4,5** | 1) *Хутка зноў у высокім небе званочкам жаваранак зазвініць**,** хутка зноў сваё вітанне нам з паднябесся кінуць жураўлі.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з’яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (=***і***);<br>2) *У полі жыта даспявала**,** навокал ліпы хораша цвілі.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца коска, бо ў іх выражаюцца адносіны адначасовасці з’яў; паміж часткамі можна ўставіць спалучальныя злучнікі ***і***, ***ды*** (=***і***);<br>3) *На дзень раней пасееш **–** тыднем раней можна будзе ўраджай сабраць.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца працяжнік, бо першая частка паказвае на ўмову таго, пра што гаворыцца ў другой; у пачатку першай часткі можна ўставіць злучнік ***калі***;<br>4) *Правіла гэта ўсім вядомае**:** сябруе з галоснымі «ў».* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп’е, бо другая частка паясняе, удакладняе змест першай; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна***;<br>5) *У бабулінай хаце для мяне найлепшы ранак**:** блінцы са свежай смятанкай заўсёды падаюцца на сняданак.* → паміж дзвюма часткамі бяззлучнікавага складанага сказа ставіцца двукроп’е, бо ў другой частцы ўказваецца прычына таго, пра што гаворыцца ў першай; паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо***, ***таму што*** | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 25–29.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 13 |
| **А17.** Адзначце нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць знакі прыпынку: | **I** [1]*Бясконца люблю родную вёску, той яе гаючы краявід,* [2]*на які немагчыма наглядзецца і* [3]*якому няма канца-краю**:*** **II** [4]*бяжыць-спяшаецца* | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку паміж часткамі ў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| *Бясконца люблю родную вёску, той яе гаючы краявід, на які немагчыма наглядзецца***1)__** *і якому няма канца-краю***2)__** *бяжыць-спяшаецца ў свет жамчужная рака***3)__** *за ёй раскінуўся раздольны луг***4)__** *а за бяскрайнім лугам – такі духмяны лес, што***5)__** *калі наступае ягадная ці грыбная пара́, то пачынаюць духмяніць дол, паветра і нават залётны ветрык.*<br><br>**Адказ: 2,3,4** | *ў свет жамчужная рака***,** 5)*за ёй раскінуўся раздольны луг***,** *а* 6)*за бяскрайнім лугам – такі духмяны лес,* 7)*што* 8)*калі наступае ягадная ці грыбная пара́,* 7)*то пачынаюць духмяніць дол, паветра і нават залётны ветрык.* → нумары пропускаў, на месцы якіх у складаным сказе з рознымі відамі сувязі частак трэба паставіць знакі прыпынку, – **2, 3, 4**:<br>1) у сэнсавай частцы **I** паміж аднароднымі даданымі часткамі **2** і **3**, якія звязаны паміж сабой пры дапамозе адзіночнага спалучальнага злучніка ***і***, ставіць коску не трэба;<br>2) паміж сэнсавымі часткамі **I** і **II**, якія аб’яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі, трэба паставіць двукроп’е, бо сэнсавая частка **II** паясняе, удакладняе змест сэнсавай часткі **I**; паміж часткамі можна ўставіць словы ***а іменна***;<br>3) у сэнсавай частцы **II** паміж граматычнымі часткамі **4** і **5**, якія аб’яднаны пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі і ў якіх выражаюцца адносіны адначасовасці з’яў, трэба паставіць коску;<br>4) у сэнсавай частцы **II** паміж граматычнымі часткамі **5** і **6**, якія маюць супастаўляльныя сэнсавыя адносіны і звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка ***а***, трэба паставіць коску;<br>5) у сэнсавай частцы **II** паміж падпарадкавальнымі злучнікамі ***што*** і ***калі***, якія стаяць побач (грамытычныя часткі **7** і **8**), коску ставіць не трэба, бо ёсць другая частка ***то*** парнага злучніка ***калі – то*** | складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 30, 31.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 14 |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **А18.** Адзначце сказы з простай мовай, якія адпавядаюць прыведзенай схеме (улічыце, што знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены): **«П», – а.**<br>1) У нашай вёсцы сакавік называюць пазімнікам адказаў сябар на маё пытанне пра назвы сакавіка<br>2) Толькі ў няўмекі рукі не баляць любіў паўтараць мой дзядуля<br>3) Калі дзьмухавец згарнуўся парасонам вучыў мяненазіраць за прыродай брат будзе дождж<br>4) Якія ты ведаеш прыказкі са словам “шчасце” спытаўся ў мяне тата<br>5) Якая незвычайная навокал снежная бель усклікнула сястрычка<br><br>**Адказ: 1,2** | 1) *«У нашай вёсцы сакавік называюць пазімнікам», – адказаў сябар на маё пытанне пра назвы сакавіка.* → сказ адпавядае прыведзенай схеме: простая мова стаіць перад словамі аўтара і мае апавядальную інтанацыю;<br>2) *«Толькі ў няўмекі рукі не баляць», – любіў паўтараць мой дзядуля.* → сказ адпавядае прыведзенай схеме: простая мова стаіць перад словамі аўтара і мае апавядальную інтанацыю;<br>3) *«Калі дзьмухавец згарнуўся парасонам, – вучыў мяне назіраць за прыродай брат, – будзе дождж».* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме: словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы і падзяляюць яе на дзве часткі (**«П, – а, – п».**);<br>4) *«Якія ты ведаеш прыказкі са словам “шчасце”?» – спытаўся ў мяне тата.* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме: простая мова мае пытальную інтанацыю (**«П?» – а.**);<br>5) *«Якая незвычайная навокал снежная бель!» – усклікнула сястрычка.* → сказ не адпавядае прыведзенай схеме: простая мова мае клічную інтанацыю (**«П!» – а.**) | Сінтаксіс і пунктуацыя.<br>Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 30.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 32.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 15 |
| **В1.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*інтэрэс, сакавіты, світар, глыток, мнагазначнасць.*<br><br>**Адказ: інтарэс** | 1) у запазычаным слове ***інтарэ́с*** незалежна ад яго паходжання не пад націскам пішацца літара ***а*** | Фанетыка і арфаэпія.<br>Арфаграфія.<br>Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 9.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 8 |
| **В2.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*цемень, кляновы, меккаваты, конегадоўля, легенда.*<br>**Адказ: мяккаваты** | 1) у слове ***мяккава́ты*** незалежна ад месца націску захоўваецца каранёвая літара ***я*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я*** | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 10.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 20.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 9 |
| **В3.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:<br>*вакзал, малацьба, французскі, колькастны, паездка.*<br>**Адказ: колькасны** | 1) у слове ***колькасны*** гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [**стн**] вымаўляецца як [**сн**] і перадаецца на пісьме спалучэннем адпаведных літар (***сн***) | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Зычныя гукі. Іх вымаўленне і правапіс. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 13, 14, 21.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 12, 17 |
| **В4.** З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна: | 1) у запазычаным слове ***навела*** падаўжэнне зычных не адбываецца і пішацца адна літара ***л*** | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Падоўжаныя | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і |

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы.<br>Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| *галлё, навелла, ванна, жыццё, разводдзе.*<br><br>**Адказ: навела** | | зычныя, іх правапіс | інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 19.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 16, 21 |
| **В5.** Запішыце назоўнік ***хлеб*** у форме роднага склону адзіночнага ліку.<br><br>**Адказ: хлеба** | 1) рэчыўны назоўнік 2-га скланення ***хлеб*** з асновай на цвёрды зычны гук у форме роднага склону адзіночнага ліку мае канчатак -***а*** | Марфалогія і арфаграфія. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 6.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 31, 33 |
| **В6.** Запішыце лічэбнік ***дзве*** ў форме творнага склону.<br><br>**Адказ: дзвюма** | 1) просты колькасны лічэбнік ***дзве*** ў форме творнага склону заканчваецца на -***ма***: *дзве – дзвюма* | Марфалогія і арфаграфія. Скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 59.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 29 |
| **В7.** З дзвюх прапанаваных у дужках граматычных формаў дзеяслова вызначце тую, у якой ён павінен быць ужыты ў сказе. Запішыце дзеяслоў у патрэбнай граматычнай форме:<br>*Некаторыя зёлкі збіраць (рэкамендуюцца, рэкамендуюць) на Купалле.*<br>**Адказ: рэкамендуюць** | 1) *Некаторыя зёлкі збіраць рэкамендуюць на Купалле.* – аднасастаўны няпэўна-асабовы сказ, у якім утваральніка дзеяння (дзейніка) няма, а выказнік павінен быць выражаны дзеясловам у форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга часу ***рэкамендуюць*** | Сінтаксіс і пунктуацыя. Двухсастаўныя сказы. Аднасастаўныя сказы, іх будова | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 25–29 |

<table>
<tr><th>Заданне.<br>Адказ</th><th>Разбор задання</th><th>Раздзел праграмы. Элемент зместу</th><th>Вучэбны дапаможнік</th></tr>
<tr><td>В8. З двух прапанаваных у дужках слоў вызначце тое, што адпавядае сэнсу сказа. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно прапанавана:<br><br>Звычайна ў пісьмовыя крыніцы паселішча трапляла не ў год свайго (заснавання, пачынання), а пасля важнай гістарычнай падзеі, так ці інакш звязанай з ім.<br><br>Адказ: заснавання</td><td>1) сэнсу сказа адпавядае слова заснаванне, значэнне якога – ‘пачатак існавання, момант утварэння чаго-небудзь’: Звычайна ў пісьмовыя крыніцы паселішча трапляла не ў год свайго заснавання, а пасля важнай гістарычнай падзеі, так ці інакш звязанай з ім.;<br>2) слова пачынанне мае значэнне ‘пачатая кім-небудь справа’ і сэнсу сказа не адпавядае</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Слова, яго лексічнае значэнне</td><td>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 22.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 23</td></tr>
<tr><td colspan="4">В9. Вызначце значэнне фразеалагізмаў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br><br>
<table>
<tr><td>А. З аглядкай.<br>Б. Без аглядкі.<br>В. Азірнуцца не паспееш.<br>Г. Сном праведніка.</td><td>1. Мае значэнне ‘без сведак’.<br>2. Мае значэнне ‘вельмі хутка, нечакана адбудзецца што-небудзь’.<br>3. Мае значэнне ‘асцярожна, абачліва (рабіць што-небудзь)’.<br>4. Па значэнні адпавядае фразеалагізму як пшаніцу прадаўшы.<br>5. Па значэнні адпавядае фразеалагізму з усіх ног.</td></tr>
</table></td></tr>
<tr><td>Адказ: А3Б5В2Г4</td><td>1) з аглядкай → мае значэнне ‘асцярожна, абачліва (рабіць што-небудзь)’;<br>2) без аглядкі → па значэнні адпавядае фразеалагізму з усіх ног – ‘вельмі хутка (бегчы)’;<br>3) азірнуцца не паспееш → мае значэнне ‘вельмі хутка, нечакана адбудзецца што-небудзь’;<br>4) сном праведніка → па значэнні адпавядае фразеалагізму як пшаніцу прадаўшы – ‘вельмі моцна спаць’</td><td>Лексіка. Фразеалогія. Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні</td><td>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 32.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 25</td></tr>
</table>

| Заданне.<br>Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **В10.** Вызначце марфемную будову прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br>**А.** Многа. — **1.** Слова, якое мае прыстаўку.<br>**Б.** Сусветны. — **2.** Слова, якое мае ***2*** суфіксы.<br>**В.** Унук. — **3.** Слова, якое мае постфікс.<br>**Г.** Камандзірскі. — **4.** Слова, якое не мае канчатка.<br>**5.** Слова, якое мае нулявы канчатак. | | | |
| **Адказ: А4Б1В5Г2** | 1) слова (прыслоўе) ***многа*** ў сваім саставе не мае канчатка, бо яно нязменнае (-***а*** – суфікс): *мног-а*;<br>2) слова ***сусветны*** ў сваім саставе мае прыстаўку ***су***-: ***су***-*свет-н-ы*;<br>3) слова ***ўнук*** у сваім саставе мае нулявы канчатак: *унук*-☐;<br>4) слова ***камандзірскі*** ў сваім саставе мае ***2*** суфіксы: *камандз*-***ір***-***ск***-*і* | Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (*вучэбн. прагр.*). Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (*прагр. уступн. іспытаў*). Асноўныя спосабы ўтварэння слоў | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 10–14 |
| **В11.** Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.<br>**А.** Памалу. — **1.** Прыставачны.<br>**Б.** Аблёт. — **2.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны).<br>**В.** Выдыхнуць. — **3.** Суфіксальны.<br>**Г.** Скланенне. — **4.** Постфіксальны.<br>**5.** Прыставачна-суфіксальны. | | | |
| **Адказ: А5Б2В1Г3** | 1) слова ***памалу*** ўтворана *прыставачна-суфіксальным* спосабам: ***мал***-*ы* + прыстаўка ***па***- і суфікс -***у***;<br>2) слова ***аблёт*** утворана *бяссуфіксным* (*нульсуфіксальным*) спосабам: ***абляц****/е/*-(*цьу*) + Ø (нулявы суфікс);<br>3) слова ***выдыхнуць*** утворана *прыставачным* спосабам: ***дыхну***-(*ць*) + прыстаўка ***вы***-;<br>4) слова ***скланенне*** ўтворана *суфіксальным* | Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (*вучэбн. прагр.*). Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (*прагр. уступн.* | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 18, 19, 39.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | способам: ***склан****/я/-(ць)*+ суфікс -***енн****-* | *іспытаў*). Асноўныя спосабы ўтварэння слоў | навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 19, 37. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 26 |

**Тэкст да заданняў В12–В22**

(1) *У мове нашага народа шмат кароткіх, але (трапных, трапятлівых) выразаў, якія пры ўмелым выкарыстанні зіхацяць, як золата, надаюць роднай мове вобразнасць, маляўнічасць, чароўнасць.* (2) *Размова вядзецца, зразумела, пра фразеалагізмы, прыказкі і прымаўкі: адвесці душу; Вялікаму каню –* ***вялікі*** *хамут. Сказаў, як звязаў.* (3) *А яшчэ – пра добразычлівыя ды жартоўныя пажаданні (Каб было і ў місцы, і ў калысцы! Каб дзяды не ведалі бяды, а ўнукі – му́кі.) і пра параўнанні (сівы, як голуб).* (4) *Адным словам, пра невычэрпныя і неўміручыя залацінкі народнай мудрасці.* (5) ***Залацінкі****, што,* ***быццам*** *узор на кашулі-вышыванцы, ажыўляюць, расквечваюць мову.* (6) *Мова,* ***аздобленая*** *такімі залацінкамі,* ***закранае*** *і розум, і сэрца.*

(7) *Безумоўна, заўсёды хочацца* ***пачуць*** *гісторыю пра тое, як узніклі цікавыя і дакладныя выразы.* (8) *Вось, напрыклад, фразеалагізм «вады не заму́ціць», які нярэдка ўжываецца ў маўленні і з якім мы (не, ні) раз сустракаліся.* (9) *Дакладна сказаць, калі і ў сувязі з чым жа ўзнік дадзены ўстойлівы выраз, цяжка.* (10) *Вядома, што ён бытуе ў многіх народаў.* (11) *І ёсць наконт гэтага пэўнае меркаванне.* (12) *Не ў адной мясцовасці ў старажытныя часы жанчыны мылі бялізну на берагах рэк.* (13) *Імкнучыся не нашкодзіць людзям, якія жылі ніжэй па цячэнні, яны стараліся не муці́ць рачной вады.* (14) *У нашы дні характарызаваць чалавека як таго, хто «вады не заму́ціць», азначае надзяляць яго сціпласцю, тактоўнасцю, (указываць, указваць) на яго ўважлівасць да іншых.* (15) *На тое, што ён нікаму і ніколі не зробіць ніякай шкоды.*

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| **В12.** Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да тэксту. Адказ запішыце лічбай. Напрыклад: 1:<br>1) тэкст афіцыйнага стылю;<br>2) тэкст навуковага стылю;<br>3) тэкст гутарковага стылю;<br>4) тэкст публіцыстычнага стылю;<br>5) тэкст мастацкага стылю.<br><br>**Адказ: 4** | тэксту адпавядае сцверджанне пад нумарам **4**: тэкст ***публіцыстычнага стылю***, таму што:<br>1) адрасат тэксту з’яўляецца масавым;<br>2) асноўная задача аўтара тэксту – паведаміць інфармацыю і ўздзейнічаць на думкі чытача, выклікаючы пэўны водгук;<br>3) матэрыял тэксту пададзены лаканічна, даходліва; характэрныя яму ацэначнасць і вобразнасць тлумачацца тым, што аўтар, перадаючы інфармацыю, выражае да яе сваё стаўленне;<br>4) тэксту характэрны інфармацыйная насычанасць, канкрэтнасць;<br>5) у тэксце ёсць моўна-выяўленчыя сродкі, характэрныя для публіцыстычных жанраў: | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Функцыянальныя стылі маўлення | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 3, 4. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 7–9. Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | эпітэты (*добразычлівыя* пажаданні, *невычэрпныя* і *неўміручыя* залацінкі народнай мудрасці), метафары (залацінкі *ажыўляюць, расквечваюць мову*; мова *закранае і розум, і сэрца*), параўнанні (зіхацяць, *як золата*; залацінкі, *быццам узор на кашулі-вышыванцы*);<br>6) у тэксце ўжыты сказы з пабочнымі словамі | | Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 5.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 7.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021. – § 2 |
| **В13.** З двух слоў, выдзеленых у ***5-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з’яўляецца сродкам сувязі ***4-га*** і ***5-га*** сказаў. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***5-м*** сказе.<br><br>**Адказ: залацінкі** | 1) з двух слоў, выдзеленых у ***5-м*** сказе тэксту, сродкам сувязі з’яўляецца лексічны паўтор ***залацінкі*** | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Сродкі сувязі сказаў у тэксце | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 2.<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – С. 18.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – § 2.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| | | | павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 3 |
| **В14.** З двух слоў, прапанаваных у дужках у ***1-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***1-м*** сказе.<br><br>**Адказ: трапных** | 1) з двух слоў ***трапных*** і ***трапятлівых***, якія з'яўляюцца паронімамі, у ***1-м*** сказе тэксту павінна быць ужыта слова ***трапных*** (*трапны* – '*які дакладна і правільна падмячае, схоплівае што-небудзь, дакладна і востра выражае, перадае асноўную сутнасць з'явы*'): *трапных выразаў*;<br>2) слова ***трапятлівых*** (*трапятлівы* – '*які пастаянна варушыцца, дрыжыць*') са словам *выраз* лексічна не спалучаецца | Маўленне. Тэкст. Стылістыка. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Паронімы | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 5, 23, 24 |
| **В15.** Знайдзіце ў ***7-м*** сказе тэксту слова, у якім ёсць зычны гук [**з'**]. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***7-м*** сказе.<br><br>**Адказ: узніклі** | 1) у слове ***ўзніклі*** (***7-ы*** сказ тэксту) свісцячы зычны гук [**з**] у пазіцыі перад мяккім зычным гукам [**н'**] вымаўляецца мякка – [**з'**]: [уз'н'ікл'і] | Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія. Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 2. – § 14, 15.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 6, 18 |
| **В16.** Запішыце выдзелены ў ***2-м*** сказе тэксту прыметнік у простай форме вышэйшай ступені параўнання.<br><br>**Адказ: большы** | 1) простая форма вышэйшай ступені параўнання прыметніка ***вялікі*** (***2-і*** сказ тэксту) утвараецца пры дапамозе іншай асновы – ***большы*** | Марфалогія і арфаграфія. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 45.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 28 |
| **В17.** Знайдзіце ў ***15-м*** сказе тэксту слова, якое не | 1) у ***15-м*** сказе тэксту ў займенніку ***нікóму*** | Марфалогія і | Беларуская мова : вучэб. дапам. |

| Заданне. Адказ | Разбор задання | Раздзел праграмы. Элемент зместу | Вучэбны дапаможнік |
|---|---|---|---|
| адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы. Запішыце гэта слова правільна.<br><br>**Адказ: нікому** | (форма давальнага склону адмоўнага займенніка ***ніхто***) націск падае на другі склад; пад націскам пішацца літара ***о*** | арфаграфія. Скланенне і правапіс займеннікаў | для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 73.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 30 |
| **B18.** З двух дзеясловаў, прапанаваных у дужках у ***14-м*** сказе тэксту, вызначце той, які адпавядае нормам беларускай літаратурнай мовы. Запішыце гэты дзеяслоў так, як ён пададзены ў ***14-м*** сказе.<br><br>**Адказ: указваць** | 1) у ***14-м*** сказе тэксту нормам беларускай літаратурнай мовы адпавядае дзеяслоў ***указваць***, які мае суфікс -***ва***-, бо ў форме ***1-й*** асобы адзіночнага ліку заканчваецца на -***ваю***: *указ**ваю***;<br>2) з суфіксам -***ыва***- пішуцца дзеясловы, у аснове якіх ёсць спалучэнне зычных з канцавымі ***л***, ***н***, ***р***: *адыг**р**ываць* | Марфалогія і арфаграфія. Правапіс дзеясловаў з суфіксамі -*ава*- (-*ява*-), -*ыва*- (-*іва*-), -*ва*- | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 14 |
| **B19.** Ад асновы дзеяслова, выдзеленага ў ***7-м*** сказе тэксту, утварыце поўны дзеепрыметнік залежнага стану і запішыце яго ў форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду.<br><br>**Адказ: пачуты** | 1) ад асновы неазначальнай формы дзеяслова на ***у*** ўтвараецца дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу з дапамогай суфікса -***т***-: ***<u>пачу</u>ць*** (***7-ы*** сказ тэксту) – ***пачуты***;<br>2) поўны дзеепрыметнік з асновай на цвёрды зычны гук у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду мае канчатак -***ы*** | Марфалогія і арфаграфія. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 23–25.<br>Беларуская мова : вучэб. дапам. для 10-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 32 |
| **B20.** Знайдзіце ў ***9-м*** сказе тэксту часціцу і запішыце яе.<br><br>**Адказ: жа** | 1) у ***9-м*** сказе тэксту ўжыта ўзмацняльная часціца ***жа*** | Марфалогія і арфаграфія. Службовыя часціны мовы | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 49, 50 |
| **B21.** З дзвюх часціц, прапанаваных у дужках у ***8-м*** | 1) у ***8-м*** сказе тэксту ў спалучэнні ***не раз*** са | Марфалогія і | Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. |

| **Заданне. Адказ** | **Разбор задання** | **Раздзел праграмы. Элемент зместу** | **Вучэбны дапаможнік** |
|---|---|---|---|
| сказе тэксту, вызначце тую, якая павінна быць ужыта ў дадзеным сказе. Запішыце гэту часціцу.<br><br>**Адказ: не** | значэннем *‘часта’* ўжываецца часціца ***не***: *Вось, напрыклад, фразеалагізм «вады не замýціць», які нярэдка ўжываецца ў маўленні і з якім мы не раз сустракаліся.* | арфаграфія. Часціцы ***не*** і ***ні***, іх ужыванне і правапіс | дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 51;<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – практ. 27 |
| **В22.** З двух слоў, выдзеленых у ***6-м*** сказе тэксту, вызначце тое, якое з’яўляецца выказнікам. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***6-м*** сказе.<br><br>**Адказ: закранае** | 1) у ***6-м*** сказе тэксту выказнікам з’яўляецца дзеяслоў ***закранае***, які абазначае тое, што гаворыцца аб прадмеце маўлення (дзейніку *мова*) і адказвае на пытанне *што робіць?*: *Мова, аздобленая такімі залацінкамі, закранае і розум, і сэрца.*<br>2) *аздобленая такімі залацінкамі* – развітае азначэнне, выражанае дзеепрыметнікавым зваротам | Сінтаксіс і пунктуацыя. Галоўныя і даданыя члены сказа. Спосабы выражэння галоўных і даданых членаў сказа | Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Г. М. Валочка [і інш.]. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019. – Ч. 1. – § 19.<br>Валочка, Г. М. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, С. А. Язерская. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 22;<br>Бадзевіч, З. І. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. – § 16 |

*Вучэбн. прагр.* – вучэбныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для V–IX класаў, X–XI класаў (базавы ўзровень), зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*Прагр. уступн. іспытаў* – Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, 2023 год, зацверджанай загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31.10.2022 № 644.